УДК 355.231.1+373]:785.13

*К. У. Петрачкоў*

# Узаемадзеянне ваенных аркестраў і навучальных устаноў у патрыятычным выхаванні кадэтаў і школьнікаў Беларусі

*Абумоўлена актуальнасць узаемадзеяння ўстаноў адукацыі з Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь з мэтай патрыятычнага выхавання моладзі.*

*Разгледжаны змест і асноўныя формы сумеснай работы ваенных аркестраў з кадэцкімі вучылішчамі і класамі. Падкрэслена эфектыўнасць іх супрацоўніцтва ў навучанні падлеткаў асновам ваеннай справы і фарміраванні грамадзянскай самасвядомасці. На сённяшні дзень пытанне ўзаемадзеяння ваенных аркестраў з адукацыйнымі арганізацыямі патрабуе навуковага абгрунтавання.*

Адной з галоўных задач дзяржаўнай палітыкі Беларусі ў сферы адукацыі з'яўляецца патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь аказваюць падтрымку дзяржаўным установам адукацыі (кадэцкім вучылішчам і класам) у выглядзе арганізаванага супрацоўніцтва з вайсковымі часцямі. Дадзеныя навучальныя ўстановы арыентуюцца на фарміраванне ў падлеткаў патрыятычных пачуццяў, valявых якасцей, любові да Айчыны, маральных і духоўных каштоўнасцей [7].

*Мэта даследавання* – паказаць неабходнасць і карысць супрацоўніцтва навучальных устаноў з вайсковымі часцямі, яго ролю ва ўмацаванні грамадзянскіх сувязей.

У беларускіх абласных цэнтрах створаны кадэцкія навучальныя ўстановы інтэрнацкага тыпу і спецыяльнай накіраванасці [5]. Пры агульнаадукацыйных школах існуюць ваенна-патрыятычныя класы, у якіх прадугледжаны шэраг мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці: урокі мужнасці, агляды-конкурсы песень, правядзенне спартыўных спаборніцтваў і інш. Іх дзейнасць накіравана на рэалізацыю комплексных адукацыйных функцый (набыццё ведаў і навыкаў, неабходных для ваеннай службы) і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі [3].

Задачы па павышэнні эфектыўнасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання падлеткаў адлюстраваны ў нарматыўна-прававых актах [2; 3], Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (арт. 18) [1] і Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі [4]. 2020 г. адзначаны правядзеннем вялікай колькасці мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці, прымеркаваных да Года малой радзімы і 75-гадовага юбілею Вялікай Перамогі [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры ажыццяўленні ўзаемадзеяння войск і навучальных устаноў адным з эфектыўных сродкаў выхавання з'яўляецца ваенны аркестр. Выступленні аркестра ўплываюць на эмацыянальна-маральны стан кадэтаў і школьнікаў, выклікаюць пэўную актыўнасць, фарміруюць патрыятычныя пачуцці.

На думку Ф. А. Самоніна, «асаблівую ролю ў працэсе грамадзянска-патрыятычнага выхавання іграе ваенны аркестр, які валодае ўнікальным, мастацка-творчым і мастацка-педагагічным патэнцыялам» (пераклад наш. – *К. П.*) [6, с. 91]. Такім чынам, вайсковы аркестр таксама з'яўляецца педагагічным інструментам у вырашэнні задач патрыятычнага выхавання.

Разгледзім асноўныя формы ўзаемадзеяння ваенных аркестраў з установамі адукацыі:

– правядзенне ўрачыстасцей і рытуалаў;
– правядзенне агляд аў строю і песні;
– выкананне і дэманстрацыя плац-канцэртаў ваеннага аркестра;
– ажыццяўленне і рэалізацыя канцэртнай дзейнасці;
– правядзенне лекцый-канцэртаў ваеннага аркестра для кадэтаў і школьнікаў;
– удзел ваеннага аркестра ў рэспубліканскіх, ваенна-спартыўных і іншых грамадска-масавых мерапрыемствах.

Адной з форм супрацоўніцтва ваенных аркестраў з адукацыйнымі ўстановамі з'яўляецца правядзенне ўрачыстасцей і рытуалаў. Знаёмства з вайсковымі рытуаламі садзейнічае фарміраванню першапачатковых асноў ваеннай адукацыі, выхаванню пачуццяў патрыятызму і любові да Радзімы. Вядучая роля ў рытуалах належыць ваенным аркестрам, якія станоўча ўздзейнічаюць на паводзіны кадэтаў, падкрэсліваюць узровень іх выхаванасці і агульную культуру.

Для ўмацавання «суворАўскіх» традыцый у кадэцкіх навучальных установах праводзяцца такія рытуалы, як урачыстае ўручэнне Сцяга кадэцкага корпуса, агляды строю і песні, афіцыйныя цырымоніі прысвячэння ў кадэты, прыняцця запаведзей і клятваў кадэтаў, прыёму і выпуску.

У сістэме навучання і выхавання кадэцкіх школ названыя рытуалы абавязковыя (рэгламентуюцца ўставам) і могуць праходзіць з удзелам ваенных аркестраў, якія надаюць урачыстаму мерапрыемству эмацыянальнасці, адлюстроўваюць вернасць вайсковай традыцыі. Правядзенне афіцыйных актаў такога кшталту нагадвае навучэнцам пра ўсталяваны вайсковы парадак: страявы агляд, рытуал уздыму і спуску Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, праходжанне ўрачыстым маршам.

Рытуалы і цырымоніі з'яўляюцца значным сегментам у вучэбна-адукацыйнай дзейнасці, патрыятычным выхаванні навучэнцаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у такіх установах. Гэтаму спрыяе іх удзел у дзяржаўных святах, такіх як Дзень абаронцаў Айчыны (23 лютага), Дзень Перамогі (9 мая), Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь (10 мая), Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі; 3 ліпеня). Менавіта ў гэтыя важныя для Беларусі даты арганізуюцца масавыя шэсці, мітынгі, урачыстае ўскладанне кветак ля помнікаў і іншыя мерапрыемствы, значныя ў кантэксце патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Асаблівую папулярнасць у адукацыйных установах набываюць агляды конкурсу строю і песні. Страявая песня як абавязковы элемент пры правядзенні рытуалаў спрыяе згуртаванню навучэнцаў, умацаванню дружбы ў калектыве, з'яўляецца адным з найважнейшых сродкаў выхавання.

У рэпертуары пераважаюць страявыя песні патрыятычнага напрамку, таксама пра побыт і жыццё кадэтаў: «Адслужу Беларусі», «Абаронцы», «Армія мая», «Чакай мяне, матуля», «Кадэцкае братэрства», «Айчыны нашай сцяг» і інш.

У Беларусі штогод праводзіцца агляд-конкурс па страявой падрыхтоўцы сярод кадэцкіх устаноў. Удзел ваенных аркестраў у аглядах страявой песні павышае ўзровень іх падрыхтоўкі, аказвае метадычную дапамогу пры правядзенні вучэбна-метадычных заняткаў з ротнымі барабаншчыкамі і г. д.

Вядучым жанрам канцэртнай дзейнасці ваенных аркестраў з'яўляецца плац-канцэрт, выступленні якога прымеркаваны да свят ці ўрачыстых мерапрыемстваў. У плац-канцэрце музыканты выконваюць перастройванні з улікам тэматыкі, зместу, сцэнарыя, структуры прадстаўлення, музычнае выкананне суправаджаецца элементамі харэаграфіі і тэатралізацыі [8]. Акрамя прагляду прыгожага відовішчнага выступлення музыкантаў, навучэнцы маюць магчымасць далучыцца да жанру ваеннай музыкі, глыбей пазнаць беларускую нацыянальную музычную культуру (ваенныя аркестры выконваюць і беларускія народныя песні).

Эфектна выглядаюць сумесныя выкананні артыстамі і гледачамі вядомых кампазіцый на беларускай мове ў суправаджэнні хору і ваеннага аркестра.

У якасці прыкладу можна прывесці праведзены ў Брэсцкай крэпасці фестываль ваенных аркестраў «Марш мужнасці» (г. Брэст), прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ваенная парадная форма аркестра таксама прыцягвае ўвагу навучэнцаў, спрыяе выбару будучай прафесіі.

Акрамя рэалізацыі задач патрыятычнага выхавання праз рытуалы, ваенны аркестр, ажыццяўляючы канцэртную дзейнасць, фарміруе музычную культуру, густ і эстэтычнае развіццё навучэнцаў. Значную ролю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў культурна-асветніцкай дзейнасці выконвае рэпертуар аркестра, у якім прадстаўлены пераважна музычныя творы героіка-патрыятычнай накіраванасці, а таксама беларускага нацыянальнага фальклору.

Яшчэ адным відам узаемадзеяння ваеннага аркестра з навучальнымі ўстановамі з'яўляецца рэалізацыя культурна-асветніцкага напрамку праз правядзенне ваеннымі аркестрамі лекцый-канцэртаў. Канцэрт-лекцыя складаецца з дзвюх частак: 1) чытаецца лекцыя на пэўную тэму; 2) выконваюцца музычныя творы, якія адпавядаюць выбранай тэматыцы. Навучэнцы знаёмяцца з беларускай культурай, гісторыяй, літаратурай, краязнаўствам, культурнымі традыцыямі і нацыянальным музычным фальклорам.

Тэматыка канцэрт-лекцый вар'іруецца, можа быць прысвечана гістарычным падзеям, гераічным подзвігам. Такая форма пазаўрочнай дзейнасці ваенных аркестраў дапамагае кадэтам і школьнікам адчуваць адказнасць за сваю будучыню, быць грамадзянамі Айчыны, любіць сваю зямлю і народ.

Важным напрамкам дзейнасці ваеннага аркестра з'яўляецца ўдзел у рэспубліканскіх, ваенна-спартыўных і іншых грамадска-масавых мерапрыемствах. Рэспубліканскія мерапрыемствы патрыятычнай накіраванасці праводзяцца ва ўсіх гарадах Беларусі. Сістэма спартыўных заняткаў з ваенна-прыкладным кірункам станоўча ўздзейнічае на фізічную падрыхтаванасць і паводзіны кадэтаў.

У якасці прыкладу можна прывесці Рэспубліканскую патрыятычную акцыю «За любимую Беларусь!», мерапрыемствы якой з'яўляюцца вулічнымі (што важна для ваеннага аркестра) і прысвечаны знакавым падзеям жыцця краіны, рэспубліканскім святам, дням горада.

Менавіта ў масавых урачыстых шэсцях рэспубліканскага ўзроўню адлюстравана значнасць ваеннага аркестра ў патрыятычным выхаванні.

У 2019–2020 гг. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі рэалізаваў патрыятычны праект «Беларусь помнит», прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Штогод 9 мая, у Дзень Перамогі, грамадзяне Беларусі выходзяць з партрэтамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, каб ушанаваць памяць герояў. Ваенныя аркестры ў такіх шэсцях эмацыянальна падымаюць настрой, спрыяюць патрыятычнаму выхаванню ўсіх грамадзян Беларусі. Шырокамаштабнае святкаванне Вялікай Перамогі актывізуе духоўна-маральную і культурна-гістарычную пераемнасць пакаленняў.

Ваеннымі аркестрамі забяспечваюцца ваенна-спартыўныя гульні, рэспубліканскія спартакіяды, эстафеты для кадэтаў і школьнікаў, якія праводзяцца раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі Беларусі.

Усе разгледжаныя формы рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу ваеннага аркестра комплексна ўздзейнічаюць на агульную культуру падлеткаў, узровень іх выхаванасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вызначаныя формы ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі (кадэцкіх вучылішч, школ) з ваеннымі аркестрамі спрыяюць, на нашу думку, павышэнню эфектыўнасці патрыятычнага выхавання навучэнцаў. Іх сумесная дзейнасць як састаўны кампанент адукацыйнага працэсу накіравана на духоўнае развіццё і фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці беларускай моладзі.

*1.* Кодекс Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] : 13 янв. 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 дек. 2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 21.07.2019 г. // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243. – Дата доступа: 20.11.2019.

*2.* Аб правядзенні Года малой радзімы : Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 20 чэрв. 2018 г., № 247 // Нац. прававы інтэрнэт-партал Рэсп. Беларусь. – 2018. – 2018/06/22, 1/17774.

*3.* Аб кадэцкіх вучылішчах : Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студз. 2010 г., № 54 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2010. – № 28, 1/11356. – С. 8.

*4.* Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь // Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – 2007. – № 2. – С. 9–40.

*5. Маркович, Е. П.* Воспитать человека – гражданина и патриота / Е. П. Маркович // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – № 4. – С. 30–34.

*6. Самонин, Ф. О.* Общая характеристика содержательных компонентов процесса реализации педагогического потенциала военного оркестра в воспитании военнослужащих воинской части / Ф. О. Самонин // Поволжский пед. вестн. – 2017. – Т. 5, № 1 (14). – С. 87–95.

*7. Стаценко, Ю. Н.* Перспективная модель организации взаимодействия гражданских вузов, военных учебных заведений и воинских частей по подготовке офицеров запаса и кадров для войск связи [Электронный ресурс] / Ю. Н. Стаценко, И. В. Симоненко // Гуманитарные науч. исследования. – 2016. – № 3. – Режим доступа: http://human.snauka.ru/2016/03/14482. – Дата доступа: 22.03.2020.

*8. Тагильцева, Н. Г.* Обучение военных музыкантов исполнительству на плац-концертах / Н. Г. Тагильцева, А. К. Проскуров // Педагогическое образование в России. – 2018. – № 4. – С. 100–106.

*K. Petrachkov*

**Interactions of military orchestras and educational institutions in patriotic education of cadets and students of Belarus**

*The relevance of interaction of educational institutions with the Armed Forces of the Republic of Belarus with the purpose of patriotic education of the youth is conditioned.*

*The content and main forms of joint work of military orchestras with cadet schools and classes are considered. The effectiveness of their cooperation in teaching teenagers the basics of military affairs and the formation of civic consciousness is emphasized. Today the question of the interaction of military orchestras with educational organizations requires scientific justification.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 09.04.2020.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ